CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

Układ graficzny © CKE 2013

WPISUJE ZDAJĄCY

KOD | PESEL

Miejsce na naklejkę z kodem

dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

**MAJ 2014**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

**Czas pracy: 170 minut**

**Liczba punktów do uzyskania: 70**

*Część I – 21 pkt*
*Część II – 49 pkt*

MOB-P1_1P-142

# Część I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Таццяны Рацько *Мініяцюрная кніга як феномен мастацкай культуры* і адкажы на пытанні. Адказвай выключна на аснове тэксту і толькі сваімі словамі або згодна з патрабаваннямі задання.**

Таццяна Рацько

*Мініяцюрная кніга як феномен мастацкай культуры*
(скарочана)

**1.** Кнігі суправаджаюць чалавека на працягу ўсяго жыцця. Яны даюць веды, абуджаюць думкі, прасвятляюць душу. […] Артур Шапенгаўэр[1] называў кнігі папяровай памяццю чалавека. […]

**2.** Магчыма, менавіта такую неўсвядомленую любоў і захапленне найчасцей выклікаюць мініяцюрныя кнігі. Пры першапачатковым знаёмстве яны здзіўляюць памерамі, і рэдкі чытач, убачыўшы такое выданне, адмовіць сабе ў спакусе патрымаць яго ў руках.

**3.** Існуе распаўсюджанае меркаванне, што мініяцюрныя выданні выконваюць толькі функцыю памятнага падарунка або сувеніра. Гэтае сцвярджэнне ўяўляецца слушным толькі часткова. Многія сучасныя мініяцюрныя кнігі ствараюцца не як утылітарныя рэчы, а як па-майстэрску выкананыя творы мастацтва, для якіх характэрна арганічнае спалучэнне формы і зместу.
На жаль, сёння ў беларускай навуцы адсутнічаюць комплексныя даследванні мініяцюрных выданняў. […]

**4.** Да гэтага часу не дадзена адзіная дэфініцыя паняцця мініяцюрная кніга і не выпрацаваны адзіны падыход да вызначэння памераў мініяцюрных выданняў. Кнігазнаўцы і кнігавыдаўцы ў розных краінах па-свойму вызначаюць фармат мініяцюрных кніг, а ў літаратуры сустракаецца мноства найменняў такіх выданняў: мікраскапічныя выданні, мікравыданні, мікрабіблон, кнігі-калібры, кнігі-карлікі (англ. midget books), кнігі-ліліпуты, найменшыя кнігі […], кніжачка (польск. książeczka), кніжкі-малышкі, кнігі-малюткі, маленькія кнігі, кішэнныя кнігі і інш. […]

**5.** Развіццё кнігі (у тым ліку і мініяцюрнай) як адзінага арганізма непарыўна[2] звязана з развіццём мастацкай літаратуры, паліграфічнымі магчымасцямі стварэння кнігі, а таксама з нацыянальнымі асаблівасцямі і сацыякультурным працэсам у цэлым. Змяненне гэтых фактараў, абумоўленае рознымі прычынамі, вызначае ўвесь знешні воблік кнігі: шрыфт, пабудову старонкі, стыль кніжнай ілюстрацыі, фармат і г.д.
Мініяцюрныя рукапісы вядомы яшчэ з антычных часоў, пра іх неаднаразова згадвалі ў сваіх працах старажытнарымскія аўтары.

**6.** Першыя друкаваныя мініяцюрныя кнігі (пераважна рэлігійнага характару) з'явіліся яшчэ ў інкунабульны перыяд[3] кнігадрукавання (да 1 студзеня 1501 г.). У працэсе ўдасканалення тэхналогій кніжны фармат паступова памяншаўся з-за імкнення зрабіць выданні больш таннымі, зручнымі для чытання і даступнымі для розных сацыяльных пластоў. У аснову фармату кнігі быў пакладзены памер (доля) аркуша паперы.

---

[1] Артур Шапенгаўэр – нямецкі філосаф.
[2] Непарыўны – такі, які не паддаецца раз'яднанню на часткі.
[3] Інкунабульны перыяд – кнігі, выдадзеныя ў Еўропе ад пачатку кнігадрукавання і да 1 студзеня 1501.

**7.** У пачатку XVI ст. італьянскі выдавец, вучоны-гуманіст, заснавальнік кніжнай дынастыі Альд Пій Мануцый адным з першых пачаў выпускаць кнігі ў невялікім фармаце […], ажыцявіўшы рэвалюцыю ў друкарскай справе. Першым выданнем малога фармату (1/8 долі папяровага аркуша) быў зборнік выбраных твораў Вергілія, выпушчаны ў Венецыі ў 1501 г.

**8.** Альд Мануцый увёў у карыстанне шрыфт павышанай ёмістасці з нахільным напісаннем літар, які атрымаў назву *курсіў*. Згодна з паданнем, курсіў быў распрацаваны на аснове почырка выдатнага італьянскага паэта Франчэска Петраркі. Гэта адкрыла новыя магчымасці для памяншэння фармату выданняў, бо раней мініяцюрныя кнігі друкаваліся тымі ж шрыфтамі, што і кнігі стандартнага памеру. […]

**9.** Альдзіны – выданні Альда Мануцыя – выклікалі шмат пераймванняў і падробак, дзеля барацьбы з імі выдавец увёў сваю фірменную марку – дэльфіна, што абвівае якар. У XVI ст. пашырылася кола тэм мініяцюрных выданняў. Друкаваліся не толькі малітвасловы, але і творы мастацкай літаратуры. […]

**10.** Мініяцюрныя выданні ў XVII ст. у Заходняй Еўропе атрымалі асабліва шырокую папулярнасць. Іх масавы выпуск першымі пачалі ажыцяўляць нідэрландскія друкары і кнігагандляры Эльзевіры. Іх выданні ўяўляюць цэлую эпоху ў гісторыі мастацтва кнігі, і перш за ўсё па фармаце і шрыфце. […]

Выданні Эльзевіраў адрозніваліся высокім узроўнем паліграфічнага выканання, выразным і прыгожым шрыфтам, прастатой і вытанчанасцю афармлення.

Кампактныя кнігі невялікага фармату каштавалі значна танней, што садзейнічала павелічэнню тыражоў. […]

**11.** У XVIII – XIX стст. ініцыятыву ў галіне выдання мініяцюрных кніг захапілі французы – Барбу, Фурнье, Дзідо. З некаторым спазненнем з'явіліся англійскія мініяцюрныя выданні. […]

Новы этап у гісторыі мініяцюрных выданняў пачаўся з вынаходніцтвам фатаграфіі і шырокага распаўсюджання (у 70 – 80 гг. XIX ст.) фотамеханічных спосабаў рэпрадукавання. Стала магчымым практычна не абмежаванае памяншэнне тэкставых і ілюстрацыйных матэрыялаў.

Фотамеханічны спосаб вырабу друкаваных форм, які выкарыстоўваўся для стварэння мініяцюрных кніг, быў адкрыты нямецкім і рускім фотамеханікам, гісторыкам кнігадрукавання Георгіем Скамоні.

**12.** Першымі мініяцюрнымі кнігамі ў Савецкай Беларусі сталі *XXIII Дзяржынская раённая канферэнцыя (3–7 мая 1930 г.)* (1930, Гомель) і *Ударнікам бальшавіцкага друку* (1932, Мінск).

Сістэматычны выпуск беларускіх мініяцюрных кніг пачаўся з 1963 г., калі на Мінскім паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа быў надрукаваны зборнік вершаў і песень *Звонкія крыніцы* Адама Русака (69×100 мм). […]

Т. Рацько, *Мініяцюрная кніга як феномен мастацкай культуры,* "Роднае слова", 2012, № 3, с. 80–83.

# Заданні да тэксту

## Заданне 1 *(1 пункт)*

Растлумач фармулёўку А. Шапенгаўэра *кнігі папяровай памяццю чалавека.* (1 абзац)

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Заданне 2 *(2 пункты)*

Падбяры антонімы да слоў

1. частковы.........................................................................................................................
2. множны...........................................................................................................................
3. антычны..........................................................................................................................
4. вузкі................................................................................................................................

## Заданне 3 *(1 пункт)*

Знайдзі ў 3 абзацы і напішы словазлучэнне, якое абазначае: *рэчы з вузкім практычным прымяненнем*, або *рэчы скіраваныя толькі на непасрэдную матэрыяльную выгаду.*

.............................................................................................................................................

## Заданне 4 *(1 пункт)*

На аснове 4 абзаца, выбяры правільны адказ.
У адносінах да *мініяцюрнай кнігі*:

а) выпрацавана адзіная дэфініцыя;
б) дакладна акрэслены фармат;
в) выданні існуюць пад рознымі назвамі;
г) выданні з выразным і прыгожым шрыфтам.

## Заданне 5 *(1 пункт)*

Якую ролю выконваюць паясненні ў дужках на англійскай і польскай мовах? (4 абзац)

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Заданне 6 *(2 пункты).*

На аснове 5 і 6 абзаца напішы праўда гэта ці фальш.

| | праўда | фальш |
|---|---|---|
| 1. Воблік кнігі: шрыфт, пабудова старонкі, стыль кніжнай ілюстрацыі, фармат і г.д. змяняліся незалежна ад акружаючых фактараў. | | |
| 2. Развіццё мастацкай літаратуры, паліграфічных магчымасцяў і нацыянальныя асаблівасці паўплывялі на выгляд кніг. | | |
| 3. Не варта спалучаць развіццё кнігі з развіццём мастацкай літаратуры, паліграфічных магчымасцяў, як адзінага арганізма. | | |
| 4. Першыя друкаваныя мініяцюрныя кнігі з'явіліся пасля 1501 года. | | |

## Заданне 7 *(2 пункты)*

На аснове ўсяго тэксту прадстаў адносіны аўтаркі да мініяцюрнай кнігі. Падай адзін аргумент.

.............................................................................................................................

.............................................................................................................................

…..........................................................................................................................

…..........................................................................................................................

## Заданне 8 *(1 пункт)*

На аснове 8 абзаца адкажы, як прычыніўся да развіцця кнігадрукарства італьянскі паэт Францэска Петрарка, выбяры правільны адказ.

а) почырк італьянскага паэта стаў узорам для распрацавання новага шрыфта.
б) вершы паэта друкаваліся ў мініяцюрных кнігах.

## Заданне 9 (*2 пункты)*

Знайдзі ў тэксце словы–сінонімы, якія адносяцца да словазлучэнняў:

1. картка паперы (6 абзац) – ..............................................................................................

2. колькасць экзэмпляраў (напр. газет/кніг) (10 абзац) – ...............................................

3. малюнак, напрыклад у кнізе (5 абзац) – .......................................................................

4. кніга, у якой знаходзіцца некалькі твораў, сачыненняў (7 абзац) –...........................

## Заданне 10 *(1 пункт)*

На аснове 9 абзаца адкажы, чаму Альд Мануцый увёў у сваіх кнігах знак дэльфіна, які абвівае якар. Выбяры правільны адказ.

а) Выдавец увёў гэты знак як аздобу для сваіх кніг.
б) Выдавец абараняў свае кнігі ад копіяў.
в) Выдавец пераняў фірменны знак ад іншых.
г) Выдавец любіў дэльфінаў.

## Заданне 11 *(2 пункты)*

Карыстаючыся 9, 10, 11 абзацамі падай чатыры факты, якія паўплывалі на развіццё мініяцюрнай кнігі.

1. ..............................................................................................................................

2. ..............................................................................................................................

3. ..............................................................................................................................

4. ..............................................................................................................................

## Заданне 12 *(1 пункт)*
На аснове 11 абзаца напішы, як паўплывала вынаходніцтва фатаграфіі на развіццё і выданне мініяцюрных кніг.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Заданне 13 *(1 пункт)*
Выбяры правільны адказ. Тэкст Таццяны Рацько гэта
а) эсэ.
б) рэпартаж.
в) навукова-публіцыстычны артыкул.
г) фельетон.

## Заданне 14 *(2 пункты)*
Падай дзве жанравыя рысы тэксту.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Заданне 15 *(1 пункт)*
На аснове ўсяго тэксту вытлумач загаловак.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

## Część II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.

**Тэма 1: На аснове філасофскага пытання аб шчасці, закранутага ў вершах Н. Арсенневай і М. Танка, паразважай, з чаго "складаецца" чалавечае шчасце. Звярні ўвагу на форму абодвух твораў.**

Наталля Арсеннева

***Шчасце***

Шчасце – як сонца: маленькая хмарка
пройдзе па небе ціхім сярод дня, –
сонца ўжо свеціць так жутла, няярка,
момант – і сонца няма.

Шчасце – як вішняў вясняныя краскі:
вецер павее, заплача вясна, –
сыплюцца снегам на дол яны гразкі,
момант – і красак няма.

Шчасце – як светлыя, ясныя мары:
рэзкае слова, заўвага адна, –
і дагараюць яны у пажары,
момант – і мараў няма.

1923 г.

Н. Арсеннева, *Шчасце* [у:] Н. Арсеннева, *Пад сінім небам. Вершы (1921 – 1925),* Вільня 1927, с. 49.

Максім Танк

***Шчасце***

Простае шчасце людское,
Так як і наша з табою,

Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабарнага ў полі,

З поту, дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,

З дружбы, мацнейшай ад смерці,
З песні... І так мне здаецца:

Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б яно шчасцем.

1960 г.

М. Танк, *Шчасце* [у:] М.Танк, *Мне пару крыл дало юнацтва...Выбраная лірыка. Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ,* «Мастацкая літаратура», Мінск 2003, с. 284.

**Тэма 2: Чалавек і яго дарога жыцця. Паразважай над праблемай на аснове інтэрпрэтацыі твора Б. Сачанкі *Дарога праз лес*. Звярні ўвагу на пабудову твора.**

Барыс Сачанка

***Дарога праз лес***

Ад школы, дзе вучыў Леанід Акімавіч, да Замхоўя крыху больш сямі кіламетраў. Гэта калі праз лес, ці, як кажуць, брадамі. Дубы і клёны, сярод якіх дзе-нідзе пракідаюцца танклявыя беластвольныя бярозкі і кусты арэшніку, упіраюцца скрозь у самае неба. За парэпанымі, у два і ў тры абхваты камлямі часам нельга разгледзець малаўезджаную дарогу праз дзесяць-дваццаць крокаў.

То тут, то там на дарозе плеснеюць, гніюць доўгія дрыгвяністыя брады з жабамі ў стаячай, цвілой вадзе. За імі – зноў лес. Дрэвы адно ў адно: тоўстыя, старыя, з барадамі сівога моху на ствалах. Яны заўсёды захоўваюць адвечныя лясныя змрокі.

Лес гэты ніколі не ведаў ні пілы, ні сякеры. Ён рос, старэў, трухлеў на карані і, калі надыходзіў яго час, падаў... На яго месцы неўпрыкмет падымаўся новы. Так ішлося спрадвеку.

За адным самым вялікім на гэтай дарозе бродам – Журавым – лес нібы расступаецца, даючы месца паляне. На гэтай паляне яшчэ да вайны стаяла леснічоўка. Цяпер тут засталося толькі печышча. Усё ў быльнягу і ажынніку, яно выпірае аж на самую дарогу.

Людзі па гэтай дарозе ходзяць рэдка. Сустракаючы тут Леаніда Акімавіча, сёй-той заднавяскоўцаў пытаў:

– Чаго гэта, Акімавіч, брадамі ходзіце? Ёсцека ж дарога праз сенажаць... Куды прамей...

Настаўнік усміхаўся, хутчэй сабе, чым субяседніку, і задуменна казаў:

– Лес люблю... Ды і прывык хадзіць па гэтай дарозе...

Неяк хацелі перавесці Леаніда Акімавіча ў Замхоўскую школу, але ён, на здзіўленне ўсім, адмовіўся.

– Мне добра... Сем кіламетраў... Адпачыць пасля ўрокаў і то як след не паспееш...

Прывыклі людзі да такіх вандровак настаўніка, думаючы парою: хлопец усю вайну тут прапартызаніў. Ці мала што можа напомніць яму глухая лясная дарога?

Ідзе, крочыць Леанід Акімавіч, а ў галаве ў яго мінулае – дарагое, незабыўнае. І бесклопатнае, вясёлае маленства, прабасаножанае тут, на ўлонні прыроды, і школа, сябры, настаўнікі... Яго першае і, відаць, апошняе каханне таксама некалі блукала тут... Усплываюць сінія, празрыстыя майскія вечары з духмяным настоем яблыневай квецені ў паветры... Ён хадзіў тады адзін каля леснічоўкі. Усё чакаў – можа выйдзе яна... Ніна. «Я скажу ёй пра ўсё...» – думаў ён. Але Ніна не выходзіла. Сядзела каля прыадчыненага, нічым не завешанага акна і чытала.

«Ніна... Ты нічога не ведала. Я не асмеліўся падысці да цябе ні на адным школьным вечары, не рашыўся нават пра ўсё напісаць. Не ведала ты і пра тое, хто выкраў у цябе з партфеля твой здымак...» Ці не ён, той здымак, і загубіў усё – мару, каханне. А ён, Леанід, так бярог яго. І ў цяжкіх, крывавых баях пры адступленні, і ў школе той, куды трапіў неўзабаве пасля ранення, – усюды здымак быў з ім, як напамінак аб далёкім шчасці.

І вось стала вядома, што яго, Леаніда, самалётам пераправяць праз лінію фронта да партызан. Якраз у родныя мясціны.

З самалёта выкінуўся ноччу. Знаёмы лес сустрэў ціхім, прытоеным шэптам.

Схаваўшы пад выварацень рацыю, да самага ўсходу прабіраўся да партызанскай зоны з думкамі пра заданне, пра маці, вёску. Пра яе, Ніну...

Раніца ў той дзень выдалася нейкая насцярожаная. Манатонна ціўкалі пеначкі, спалохана лопалі крыллем, пырскаючы халоднай расой, дзікія качкі. Дыміўся, хаваючыся за кусты, туман.

–Хэндэ хох!...

Картавы голас з-пад дуба выбіў Леаніда з задумення і прымусіў нырнуць у гушчар, шукаць паратунку.

Аўтаматная чарга збіла на плячо некалькі галінак...

Леанід ведаў свой лес, брады, раку Віць... «Толькі б дабегчы да ракі...» – мільгала у галаве. Ногі правальваліся ў месіва твані, спаўзалі з купін. Гразь плюхала ў ботах. Ён чуў, як трашчала голле, каўкала дрыгвяністае багна.

«Чаму не страляюць?»

Яшчэ крокаў праз колькі ён здагадаўся: «Хочуць узяць жывога».

«Трэба скінуць гімнасцёрку, – цюкнула яму, калі ён дабег да ракі, – пакласці яе перад ботамі. Хай тады акружаюць «парашутыста»... А тым часам – у раку. На тым беразе – партызанская зона...»

Гадзіны праз дзве Леанід быў у партызанскім лагеры. І тут успомніў, што разам з гімнасцёркаю трапіў у рукі ворагаў здымак. Нінін здымак...

Праз тыдзень, ліпеньскай ноччу, Леанід наведаў маці. Ад радасці тая не ведала, што рабіць. Стаўляла на стол то малако, то халодную бульбу, якая засталася ад вячэры, то прыносіла сала. І ўсё расказвала, расказвала свае вясковыя і партызанскія навіны.

Леанід доўга не рашаўся запытаць пра Ніну. Толькі перад самым світаннем, калі ўжо адыходзіў, не вытрымаў:

– Мама, а дзе цяпер Ніна? Ніна Лучанка?

І пачуў страшнае, у што доўга не хацелася верыць...

– Няма яе ўжо, сынок... Немцы павесілі... Учора... Кажуць, трымала связь з Масквой. У кішэні парашутыста знайшлі яе здымак. Відаць, да яе пасылаўся чалавек... На допыце, кажуць, маўчала, нікога не выдала...

...Крочыць Леанід Акімавіч лясною дарогай...

Мінае лета, пачынае журботна курлыкаць жураўліная восень, пасля – мяцеліцы, снягі, а Леанід Акімавіч ходзіць і ходзіць той дарогай, па якой вялі на смерць Ніну... Яго Ніну...

Б.Сачанка, *Дарога праз лес* [у:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ,* Warszawa 2001, с. 272–274.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr........**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

# BRUDNOPIS

*(nie podlega ocenie)*

MOB-P1_1P-142

## WYPEŁNIA ZDAJĄCY

PESEL

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

Miejsce na naklejkę
z nr. PESEL

| Nr zad. | Punkty | | |
|---|---|---|---|
| | 0 | 1 | 2 |
| 1 | ☐ | ☐ | |
| 2 | ☐ | ☐ | ☐ |
| 3 | ☐ | ☐ | |
| 4 | ☐ | ☐ | |
| 5 | ☐ | ☐ | |
| 6 | ☐ | ☐ | ☐ |
| 7 | ☐ | ☐ | ☐ |
| 8 | ☐ | ☐ | |
| 9 | ☐ | ☐ | ☐ |
| 10 | ☐ | ☐ | |
| 11 | ☐ | ☐ | ☐ |
| 12 | ☐ | ☐ | |
| 13 | ☐ | ☐ | |
| 14 | ☐ | ☐ | ☐ |
| 15 | ☐ | ☐ | |

## WYPEŁNIA EGZAMINATOR

SUMA PUNKTÓW ☐☐

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| D | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| J | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |

Temat: 1 2

| | | Punkty | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Rozwinięcie tematu | | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ |
| | | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | |
| | | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | |
| Język | | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | |
| | i 1 | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | | |
| | i 2 | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | |
| | i 3 | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | | | | | | | |
| Kompozycja | | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | | | | | | | |
| | | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | ☐ | | | | | | | |

KOD EGZAMINATORA

............................................................
Czytelny podpis egzaminatora

KOD ZDAJĄCEGO